**Т. Г. Барычэўская**

# БІЯГРАФІЧНЫ КАНТЭКСТ ТВОРАЎ Х. ЦУЗАНЕКА

У сёмым са сваіх «Лістоў, што датычацца сучаснай літаратуры» Г. Э. Лесінг сказаў: «Што нам да асабістага жыцця пісьменніка?». Так і Харальд Цузанек, вядомы аўстрыйскі драматург сярэдзіны XX ст., заўсёды намагаўся раздзяляць сваю творчасць і прыватную сферу. Першасным і галоўным ён лічыў уражанне, якое складваецца ў чытача да яго драм, а не асацыяцыі з ім як асобай. Таму мы спыніліся толькі на некаторых біяграфічных фактах, якія маюць выключнае значэнне для раскрыцця творчага шляху драматурга і даюць прадстаўленне аб вытоках постмадэрнісцкіх тэндэнцый у яго п’есах.

Харальд Цузанек нарадзіўся ў Вене, у сям’і навукоўца-натураліста, які памёр ад празмернага захаплення сваёй справай. Маці свядома спрабавала выключыць усё, звязанае з гэтай тэмай, з жыцця сына, баючыся, што таго можа напаткаць лёс бацькі. Яе намаганні былі марныя, хлопчык спачатку захапіўся фізікай і астрафізікай, потым пачаў вывучаць медыцыну.

Але ў першую чаргу у гэтым дачыненні яго цікавіў чалавек і ўсё, што з ім звязана. Ён хацеў як мага лепш зразумець, хто такі чалавек якія матэрыяльныя асновы мае яго існаванне, ці змяніўся ён з цягам часу, а калі змяніўся, то чаму? Хутка пытанне «Што такое чалавек, які ён?» пашыралася да «Як стаць чалавекам?» ці нават «Чаму мы лічым сябе людзьмі?» Тады, хоць творчасць была мэтай Х. Цузанека яшчэ з трынаццаці гадоў, ён пачынае займацца сусветнай гісторыяй, гісторыяй мастацтва і філасофіяй, а таксама бярэ ўдзел у спецыяльным рэжысерскім семінары, каб атрымаць неабходныя навыкі і працаваць потым на тэлебачанні.

Такая разнастайнасць захапленняў праявіцца пазней у яго п’есах у форме свядомай эклектычнасці, характэрнай для постмадэрнісцкай драматургіі. У сувязі з гэтым можна назваць яшчэ адну значную рысу яго творчасці – у сваіх п’есах Цузанек намагаўся стварыць адзіную сусветную прастору, аб’яднаць у адным творы матывы і прыёмы, узятыя з арсенала розных субкультур, эпох і рэгіёнаў. Таму менавіта шматлікія падарожжы мелі для драматурга асаблівае значэнне.

Уражанні, якія Цузанек збірае па ўсёй Еўропе, асабліва ў Італіі і Грэцыі, становяцца рашаючымі, складаюць базу яго лірычных твораў. Ён лічыць, што звычайныя рэчы, якія мы ў стане ўбачыць, даюць нам магчымасць дакрануцца да чалавечай гісторыі і «Боскага плану Сусвету», аднак мы не ў стане зразумець гэтую рэальнасць, не ўлічваючы яе бясконцай разнастайнасці і ўзаемапранікнення. Гэтая думка адлюстравана ў яго трохрадковым вершы «Арыён на дэльфіне»: *Ужо непасрэдна за рыбай / Багі пачынаюцца. / Што застаецца мне, дружа, як не спяваць?* (пераклад наш – *Т. Б.*)

Харальд Цузанек часта сцвярджаў, што менавіта прасякнутыя сонечным святлом ландшафты Грэцыі дапамаглі яму прыйсці да высновы, што эсхаталагічнае светаўспрыманне, якое і параджае ва ўсведамленні сучаснага

чалавека ўсё няяснае і змрочнае, не закладзена ў канцэпцыі сусвету, а залежыць ад людзей, якія на працягу ўсёй сваёй гісторыі вагаюцца паміж неабходным і тым, чаго яны жадаюць да болю. Гэта вельмі значная дэталь, таму што такі пункт гледжання адрозніваецца ад агульнага для розных варыянтаў сённяшняга постмадэрну палажэння аб «стомленай» культуры і расчараванасці ва ўласных магчымасцях.

Наадварот, у персанажаў усіх п’ес драматурга заўсёды ёсць шанс самім вызначыць праз свае ўчынкі, якім будзе іх далейшы лёс. Такое стаўленне яднае Цузанека з такімі аўтарамі-экзістэнцыялістамі, як Альбер Камю і Антуан дэ Сент-Экзюперы, і дае магчымасць раскрыць пры дапамозе міфалагічных сюжэтаў сапраўдны сэнс існавання чалавека як асобы.

Падарожжы па Іспаніі і Афрыцы, пустыня Сахара як алегорыя «найвялікшай ачышчальніцы» падштурхнулі драматурга да адной з асноўных думак у яго творчасці: усе людзі носяць маскі, але калі надыходзіць час, «яны спадаюць, і чалавек застаецца сам на сам з сабой» (P. Wimmer «Der Dramatiker Harald Zusanek»). Пры гэтым чалавек можа зразумець, што маска і была яго сапраўдным «я», як гэта адбылося з галоўным персанажам п’есы «Понцій Пілат».

Акрамя звыклай для Х. Цузанека парадаксальнасці, у гэтым падыходзе адлюстравана вядомая характарыстыка постмадэрнізма як мастацкага стылю – усё можа быць прадстаўлена ў выглядзе гульні, але менавіта такім чынам раскрываюцца тыя бакі рэчаіснасці, на якія раней ніхто не звяртаў увагі. Аўтар успрымае не толькі рэальнасць і чалавека ў ёй, але і тэатр як своеасаблівыя маскі, што адначасова хаваюць і выкрываюць бясконцасць існавання і сутнасць мастацтва.

Дзякуючы ўражанням ад сваіх падарожжаў і знаёмству з іншымі культурнымі традыцыямі, Харальд Цузанек прыходзіць да высновы, што ў творчасці недапушчальная ніякая містыфікацыя, што трэба адлюстроўваць самога чалавека і працэс развіцця чалавецтва дакладна. Але гэтая думка не мае нічога агульнага з рэалізмам. Парадаксальнасць яе ў тым, што аўтар пачынае ўспрымаць «знешнюю рэальнасць часу і сучаснасці» як шанс для вялізнага самавызвалення чалавечай існасці.

Аўстрыйскі даследчык Ханс Герстынгер сцвярджае: «Цузанек адчувае, што выключна спірытуальны светапогляд, прыводзячы ў выніку да чыстага інтэлектуалізму, усё больш пашырае прорву паміж чалавекам і Богам, і зваротны шлях для чалавека магчымы толькі праз новыя (ці старыя?) узаемаадносіны з прыродай» (H. Zusanek «Piazza»).

Тут зноў прасочваюцца матывы экзістэнцыялізму: аўтар не пагаджаецца з вядомым тэарэтыкам постмадэрнізму Ліатарам, які лічыць, што наперадзе чалавецтва чакае крах этыкі і маралі, таму што ніякія метанаратывы ўжо не могуць растлумачыць яму, як ён павінен жыць далей. Харальд Цузанек выразна бачыць усю складанасць такога становішча, але пакідае людзям магчымасць памяняць яго, змяніўшы сваё стаўленне да прыроды. Інакш кажучы, чалавек павінен зрабіць выбар паміж энтрапіяй і няўпэўненасцю сваёй эпохі і новым сэнсам існавання, «які яму трэба знайсці пасярод існуючага Хаоса, бязглуздзіцы» (H. Vogelsang «Österreichische Dramatik des 20. Jahrhunderts»).

Гэта стасуецца з іншым меркаваннем, існуючым сярод сучасных літаратурных крытыкаў: «Постмадэрнізм увасабляе прынцыповую мастацка-філасофскую спробу пераадолець фундаментальную для культуры антытэзу хаосу і космасу, пераарыентаваць творчы імпульс на пошук кампрамісу паміж гэтымі ўніверсаліямі. Дыялог з хаосам у канчатковым выніку нацэлены менавіта на такі пошук» (М. Н. Ліпавецкі «Русский постмодернизм»). Як бачна з вышэй сказанага, у гэтым дачыненні пазіцыя Харальда Цузанека сапраўды можа лічыцца постмадэрнісцкай.

Аднак у гэтай сувязі нельга казаць пра ідэалістычную пазіцыю аўтара: Харальд Цузанек ваяваў і быў паранены, потым яму прыйшлося вывозіць з акупіраванай Вены жонку з нованароджанай дачкой, марна шукаць працу, і яго творы не абмінаюць сваёй увагай самыя жорсткія бакі нашага жыцця, нашага мінулага і нашай сучаснасці. Творча перапрацаваўшы ўласны досвед, ён усе ж такі прыходзіць да высновы, што, як сказана у драме «Трэці фронт»: «у сэрцы бязглуздзіцы жыве сэнс» (P. Wimmer «Der Dramatiker Harald Zusanek»). Аўтар заўсёды падкрэслівае каштоўнасць жыцця і магчымасць духоўнай перамогі ў любым выпадку.

Аўстрыйскі літаратуразнаўца Пауль Віммер лічыць, што для больш глыбокага разумення гуманістычнага пафаса драм Цузанека трэба ўявіць сабе, што гэты чалавек ў сваіх падарожжах, думках і творчых планах перажываў шматлікія варыянты чалавечага лёсу: «Філосаф у грэцкіх Кікладах, гностык у Егіпце, маніхей у час распаду Усходне-Рымскай Імперыі. Можа, нават і жыхар Атлантыды з яе ўтапічным сацыяльным строем, ці нехта з іншай Галактыкі» (P.Wimmer «Der Dramatiker Harald Zusanek»). Таму яго драматычныя творы прасякнуты не толькі эзатэрыкай, парадаксальным светаадчуваннем, але і адвечным свяшчэнным сэнсам, які мог бы аб'яднаць нават культуры розных планет.

Здольнай адказаць на адвечнае пытанне аб агульначалавечай будучыні драматургу падаецца рэлігія. У намаганні высветліць, як розныя рэлігіі паўплывалі на грамадства, Х. Цузанек прыходзіць да высновы, што іх ўласнае развіцце паказала адзін з найбольш значных напрамкаў для развіцця грамадства і агульначалавечай свядомасці. Таму апошнія некалькі дзесяцігоддзяў свайго жыцця драматург прысвяціў даследаванню сінкрэтычных эгейскіх рэлігіёзных культаў.

Зацікаўленне драматурга гэтым пытаннем невыпадковае: у ранніх культах сакральнае і звычайнае не былі яшчэ падзелены, іх адзінства з'яўлялася непарушным, яшчэ можна было адчуць адвечныя сувязі і прычыны таго, што адбывалася з нашымі продкамі і што яшчэ адбудзецца з намі. Харальд Цузанек неаднаразова падкрэслівае матывы першапрычыннасці, узаемасувязі і бясконцага ўзаемапранікнення ў такіх сваіх драматычных творах, як «Нашто ты капаеш, цэнтурыён?» («Warum gräbst du, Centurio?», 1951), «Жан з бочкі» («Jean von der Tonne», 1955), «Трэці фронт» («Die dritte Front», 1964), «Понцій Пілат» («Pontius Pilatus», 1965), «Яілгаў праўду» («Ich log die Wahrheit», 1982) і іншых.